ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ

# ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

Орган гаркому КП(б)Б, гарсавету і гарпрафсавету.

№ 70 | НЯДЗЕЛЯ, 26 САКАВІКА 1933 г. | № 70

## АБ ЛІСЬЦЕ ВІЦЕБСКАЙ ДЭЛЕГАЦЫІ З УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ КАЛГАСЬНІКАЎ - УДАРНІКАЎ І САЦСПАБОРНІЦТВЕ КАЛГАСАЎ МЕНСКАГА, ВІЦЕБСКАГА І ГОМЕЛЬСКАГА РАЁНАЎ.

*Пастанова ГК КП(б)Б ад 25 сакавіка 1933 г.*

1. Гарком КП(б)Б цалкам адабрае ліст віцебскай дэлегацыі ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў ударнікаў да ўсіх калгасьнікаў Віцебшчыны, апублікаваны ў „Віцебскім пралетары" 24 сакавіка, і мерапрыемствы нашай дэлегацыі па арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва калгасаў Менскага, Віцебскага і Гомельскага раёнаў.

2. ГК КП б Б абавязвае ўсе парт'ячэйкі сельсаветы і ўпаўнаважаных гаркому і гарсавету абгаварыць ліст дэлегацыі і практычныя задачы сацспаборніцтва ва ўсіх савгасах, каапгасах, калгасах, калгасных брыгадах і на сходах аднаасобнікаў, мабілізуючы масы калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў на такую падрыхтоўку і правядзен не веснавой сяўбы каб заваяваць сапраўды першае месца ў спаборніцтве трох раёнаў, заключаючы дагаворы па сацспаборніцтве паміж брыгадамі, калгасамі, савгасамі, каапгасамі і вёскамі.

3 Гарком асабліва падкрэсьлівае, што абгаварэньне лісту дэлегацыі і штодзённая барацьба за пяршынства ў сацспаборніцтве павінны мець сваім вынікам чоткае і своечасовае выкананьне ўсіх плянавых заданьняў, высокую якасьць усіх пасеўных работ, поўнае выкананьне устаноўленых заданьняў па ўздыме ўраджайнасьці, жалезную працоўную дысцыпліну, поўную ачыстку калгасаў ад кулацкіх і шкодніцкіх элемэнтаў, бальшавіцкую мабілізацыю мас на выкананьне абавязацельстваў па выкананьні абавязкаў перад дзяржавай па пастаўцы сельска-гаспадарчай прадукцыі.

## ПРА АБАВЯЗКОВУЮ ПАСТАЎКУ БУЛЬБЫ ДЗЯРЖАВЕ КАЛГАСАМІ І АДНААСОБНЫМІ ГАСПАДАРКАМІ.

*З пастановы Савету Народных Камісараў БССР і Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б.*

У адпаведнасьці з пастановай СНК СССР і ЦК УсеКП(б) за 20 лютага 1933 г. «Пра абавязковую пастаўку бульбы дзяржаве калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі» («Известия ЦИК СССР и ВЦИК» № 51 за 21 лютага 1933 г.), Савет Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б пастанаўляюць:

1. Парадак здачы (продажу), устаноўлены пастановамі СНК СССР і ЦК УсеКП(б) ад 9 студзеня 1933 г. і СНК БССР і ЦК КП(б)Б ад 24 лютага 1933 г. у адносінах збожжавых культур, пашырыць на бульбу і ўстанавіць для калгасаў і аднаасобных гаспадарак узамен існуючай дагаворнай (кантрактацыйнай) сыстэмы загатовак бульбы цьвёрдыя, маючыя сілу пагатку, абавязацельствы па здачы бульбы дзяржаве па ўстаноўленых дзяржаўных цэнах.

2. Устанавіць наступныя, зацьверджаныя пастановай СНК СССР за 13 сакавіка 1933 г. № 460, параённыя нормы здачы бульбы дзяржаве калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі з ураджаю 1933 г. па калгасах, якія абслугоўваюцца МТС, калгасах, якія не абслугоўваюцца МТС, калгасьніках па неаграмаджаных пасевах аднаасобных гаспадарках з разьліку на кожны гектар устаноўленнага на вясну 1933 году плянy пасеву бульбы (у цэнтнэрах):

| Раёны | Калгасы, якія абслугоўваюцца МТС | Калгасы, якія неабслуг. МТС | Калгасы па неаграмадж. па севах бульбы | Аднаасобнікі |
|---|---|---|---|---|
| . . . . . | | | | |
| . . . . . | | | | |
| . . . . . | | | | |
| Віцебскі . . . | 9,5 | 12,5 | 13,5 | 15,5 |

Устаноўленыя вышэй параённыя нормы вьяўляюцца абавязковымі для кожнага раёну і ня могуць падлягаць зьменам.

3. Устанавіць наступныя каляндарныя тэрміны выкананьня калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі гадавых абавязацельстваў па здачы бульбы дзяржаве ў процантах ад пагектарных норм, устаноўленых п. 2 гэтай пастановы:

У жніўні месяцы—2 проц.
У верасьні месяцы—20 проц.
У кастрычніку месяцы—65 проц.
З 1 па 15 лістапада—13 проц.

4. Захаваць існуючыя цэны на бульбу, якая здаецца дзяржаве.

5. У залік выкананьня калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі сваіх абавязацельстваў, устаноўленых гэтай пастановай, прымаецца толькі бульба добраякасная (сухая, ачышчаная ад зямлі, здаровая); бульба мокрая, хворая, мэханічна пашкоджаная, марожаная не залічваецца ў выкананьне абавязацельстваў калгасаў і аднаасобных гаспадарак.

6. Калгасы, якія ня выканалі сваіх абавязацельстваў па здачы бульбы дзяржаве ва ўстаноўленыя гэтай пастановай каляндарныя тэрміны, прыцягваюцца праз сельсаветы да штрафу грашыма ў разьмеры рыначнага кошту недавыкананай часткі абавязацельства і звыш гэтага да гэтых калгасаў прад'яўляюцца патрабаваньні аб датэрміновым выкананьні ўсяго гадавога абавязацельства, падлягаючага спагнаньню ў бясспрэчным парадку.

Аднаасобныя гаспадаркі, якія ня выканалі сваіх абавязацельстваў па здачы бульбы дзяржаве да ўстаноўленага гэтай пастановай тэрміну, прыцягваюцца да судовай адказнасьці паводле артыкулу 94 Крымінальнага кодэксу БССР.

7 Выкананьне ўстаноўленых гэтай пастановай абавязацельстваў па здачы бульбы дзяржаве зьяўляецца першачарговым абавязкам кожнага калгасу і аднаасобнай гаспадаркі і павінна быць праведзена з першых збораў. Устанавіць, што калгасны гандаль бульбай будзе дазваляцца толькі пасьля выкананьня ўстаноўленага на аснове гэтай пастановы пляну пастаўкі бульбы ў цэлым па рэспубліцы і поўнай ссыпкі, пасьля выкананьня плянаў пастаўкі бульбы, насенных фондаў.

8. Бязумоўна забараняецца мясцовым органам улады і загатоўчым органам дапускаць сустрэчныя пляны або накладаць на калгасы і аднаасобныя гаспадаркі абавязацельствы па здачы бульбы, перавышаючыя пагектарныя нормы, устаноўленыя гэтым законам. Усе лішкі бульбы, пасьля выкананьня абавязацельстваў па здачы дзяржаве бульбы, застаюцца ў поўным распараджэньні саміх калгасаў, калгасьнікаў і аднаасобнікаў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Сэкратар ЦК КП(б)Б М. ГІКАЛО
20 сакавіка 1933 г.
г. Менск.

ДЭКАДНІК ПРАВЕРКІ ГАТОЎНАСЬЦІ ЦЯГАВАЙ СІЛЫ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ.

## У КАЛГАСАХ: „ДРУГАЯ ПЯЦІГОДКА", „БАЛЬШАВІК" І „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" НЯ РЫХТУЮЦЬ КАНЯ ДА ПАЛЯВЫХ РАБОТ.

### ЗАТРЫМКА НА СКЛАДАХ ТАК ВОЙСТРА ПАТРЭБНЫХ МТС, САВГАСАМ І КАЛГАСАМ ЗАПАСНЫХ ЧАСТАК ДА ТРАКТАРАЎ І СЕЛЬГАСМАШЫН—ЦЯГЧЭЙШАЕ ЗЛАЧЫНСТВА ПЕРАД БАЛЬШАВІЦКАЙ СЯЎБОЙ.

### Там, дзе дырэктывы партыі і ўраду ігнаруюцца.

Коняй да сяўбы ў калгасе «Другая пяцігодка» (Бабініцкі сельсавет) ня рыхтуюць. Амаль усе коні ніжэй сярэдняй упітанасьці. Частка коняй вельмі змораная, каля паловы усяго конскага пагалоўя патрабуе пасіленага адкорму. Такое становішча стварылася з за нядобрасумленных адносін большасьці конюхаў да сваіх абавязкаў і ўчасьціўшыхся за апошні час барбарскіх бязмэтавых разьвезданў.

Але там, дзе на стайні—сапраўды добрасумленны калгасьнік-ударнік, там коні ў добрым стане. Напрыклад, стайня конюха Драздова Аўдакіма недарма лічыцца лепшай па калгасе, нездарма коняй гэтай брыгады на важжох утрымаць нельга. Такі стан коняй дасягнуты дзякуючы добрасумленнай і ўпартай працы Драздова. Ён днём і ноччу бывае на стайні, правільна корміць коняй, штодзённа чысьціць іх, беражэ калгасную стайню, як сваю. Драздоў, як лепшы конюх-ударнік, заваяваў сабе вялізарны аўтарытэт сярод калгасьнікаў.

І наадварот, у другой брыгадзе коняй аддалі пад апёку вара, п'яніцы і карцёжніка Партненка, які большую частку свайго часу праводзіць не каля коняй, а за картамі і гарэлкай. А ў рэзультаце коні на яго стайні ад штодзённага недаяданьня цягнуцца як сонныя мухі, на вяршок закараўшыя брудам.

Амаль такі-ж малюнак на стайні першай брыгады ў конюха Пеграчэнка Надзеі. З кані захварэлі, патрабуюць лячэньня, а астатнія—страшэнна худыя і закормленыя. Норм кармленьня Петрачэнка ніколі ня прытрымліваецца, частка сена ідзе ў гной, бо коні раскідваюць яго, а конюх не падбірае. Ня лепш і на стайні 3-й брыгады, у конюха Сямёнава Базыля.

18 сакавіка меў месца наступны агіднейшы факт, паказваючы, наколькі адказныя людзі, займаючыя камандныя вышыні ў калгасе, без адказны за становішча конскага пагалоўя. Брыгадзір Карнеўскі, адказны за разьмеркаваньне корму, і Сідарэнка Язэп у кампаніі з калгасьнікамі Яміменка і Балваненка ў час выдачы сена коням напіліся п'янымі, а коні стаялі галодныя ўвесь дзень. Такія злачынна-шкодніцкія адносіны да каня не атрымліваюць рашучага адпору з боку праўленьня калгасу.

У калгасе навісла пагроза выхадам паловы коняй са строю, бо нават слабамоцныя коні, пастаўленыя на адпачынак, бязьлітасна эксплёатуюцца.

Аздараўленьне конскага пагалоўя павінна быць дасягнута шляхам самай рашучай ачысткі стайняў ад пралезных туды клясава-варожых элемэнтаў. Праўленьне калгасу абавязана ажыцьцявіць дырэктывы партыі і ўраду аб падрыхтоўцы цягавай сілы да веснавой сяўбы.

Брыгадзір «В. П» С. Раскін.
Рэдкалегія насьценгазэты „Барацьбіт".

### Аб ходзе падрыхтоўкі да сяўбы па аднаасобным сэктары.

*Пастанова бюро гаркому КП(б)Б і прэзыдыуму гарсавету ад 21( сакавіка 1933 году.*

Бюро ГК КП(б)Б і прэзыдыум гарсавету адзначаюць нездавальняючы ход падрыхтоўкі да веснавой сяўбы па аднаасобным сэктары. Няма поўнага давядзеньня плянаў сяўбы ні па адным сельсавеце, страхавыя фонды поўнасьцю не засыпаны (з 39-ці цэнтнэраў аўсу засыпана 21 цэнтн., па бабовых—з 30 ці цэнтнэраў засыпана 4 цэнтн.), недапушчальна марудна ідзе вывазка ўгнаеньня—гною вывезена толькі 240 вазоў.

Бюро ГК КП(б)Б і прэзыдыум гарсавету пастаўляюць:

1. Пад асабістую адказнасьць старшынь сельсаветаў і сэкратароў парт'ячэек на працягу пяці дзён давесьці поўнасьцю пляны сяўбы да кожнага двара.

2. Арганізаваць і правесьці па працягу трох дзён праверку засыпкі, захаваньня і ачысткі насеньня па кожнай аднаасобнай гаспадарцы.

3. Абавязаць старшынь калгасаў арганізаваць усямерную дапамогу аднаасобнікам у справе рамонту інвэнтару і ачысткі насеньня.

4. Разгарнуць шырокую работу па давядзеньні да кожнага аднаасобніка аграправіл.

5. Правесьці па сельсаветах, як масавую палітычную кампанію, з аднаведнай папярэдняй падрыхтоўкай зьлёты перадавых беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў з пастаноўкай на зьлётах пытаньня аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы і мерапрыемствах савецкага ўраду ў калгасным будаўніцтве.

6. Зьлёты правесьці 30 сакавіка 1933 г.

7. Адказнымі за падрыхтоўчую работу па скліканьні зьлётаў зьяўляюцца ўпаўнаважаныя ГК КП(б)Б па сельсаветах.

8. Дакладчыкамі на зьлётах прызначыць наступных т. т.: Вайнман—Даўжанскі сельсавет, Вэнзель—Старасельскі, Стронгін—Машканскі, Зіноўеў—Бараўлянскі, Сытоў—Мікалаёўскі, Клейнбэрг—Рудакоўскі, Плаўнік—В.-Лётчанскі, Міцькоў—Ялагінскі, Моін—Сялюцкі, Кардашэнка—Віцебскі, Увараў—Замастоцкі, Кавалёў—Рудніцкі, Гаеўскі—Шумнянскі, Балычэнка—Бабініцкі, Іваноў—Міхалёўскі.

Сэкратар ГК КП(б)Б Міцькоў.
Старшыня гарсавету Кардашэнка.

### Няма дрэннага каня, ёсьць дрэнны гаспадар.

Калгас «Бальшавік» (Бабініцкі сельсавет) уключыўся ў дэкаднік праверкі падрыхтаванасьці конскай цягавай сілы да сяўбы.

Камсамольскай ячэйкай і насьценгазэтай «Бальшавіцкі сыгнал» праведзен масавы рэйд-праверка становішча конскага пагалоўя ў калгасе. Выяўлены шкоднікі каня: Чыжыкаў М., Чыжыкава С., якія замучылі коняй на ўласных работах. Устаноўлены недапушчальна дрэнныя адносіны да выкананьня сваіх абавязкаў з боку конюха Бруева Сяргея.

Нараду з гэтым у калгасе ёсьць перадавікі ў доглядзе каня. Лепшым конюхам па калгасе зьяўляецца ўдарнік Якубенка.

«Няма дрэннага каня, а ёсьць дрэнны гаспадар»—заявілі ўдзельнікі рэйду праз газэту.

Брыгадзір «В. П.» Раскін.

### Шкоднікі да гэтага часу не пакараны.

(Ліст калгасьніка).

У калгасе «Інтэрнацыянал» (Даўжанскі сельсавет), у брыгадзе № 2 (брыгадзір Калінчанка) коні даведзены да жудаснага становішча і ледзь трымаюцца на нагах. Хворую кабыліцу ў час моцных марозаў наўмысьля паставілі ў дзіравы сарай, дзе яна стаяла бяз догляду і лячэньня. У брыгадзе № 3 з восені растранжырылі кормы, а зараз коням няма кармоў.

Хаця калгас і пазбавіўся ад 8-мі кулакоў-шкоднікаў, але вораг канчаткова не дабіт. Маюцца факты, калі з-за недагляду брыгадзіраў у брыгадзе № 3 зьмёрзла больш 300 пудоў насеннай бульбы, у брыгадзе № 2 зьмёрзла 100 пудоў бульбы, у брыгадзе № 4—60 пудоў бульбы, а шкоднікі і да гэтага часу не пакараны.

Калгасьнік.

РАМОНТ ТРАКТАРАЎ.

### РАМОНТНАЯ БРЫГАДА ЎЗБРОЕНА ЭНТУЗЫЯЗМАМ.

**Даставіць на „Камінтэрн" неабходныя часткі!**

Мы пісалі ў «Віцебскі пралетары» ў якім становішчы прыбылі 17 сакавіка на завод «Камінтэрн» для рамонту чатыры трактары „Інтэрнацыянал", якія належаць Віцмалпрамтрэсту. Трактары прыбылі разабранымі, трактарныя часткі загразьненыя, многія каштоўныя часткі былі пагбаны і мелі трэшчыны (радыятары, блёкі і інш.), шмат частак не хапала.

Для лепшага і хутчэйшага выпуску з рамонту гэтых трактараў, заводакіраўніцтвам была вылучана брыгада з лепшых ударнікаў і высокакваліфікаваных рабочых. Брыгада складаецца з 9 ці чалавек т.т.: Васіленка, Ісакава, Карнішова, Чарвінскага, Танкевіча, Посьнікава П., Абрына і Рымана на чале з брыгадзірам т. Посьнікавым І. На рамонт радыятараў вылучана брыгада ў складзе т.т. Рудэнка і Рэзьдзіна Да кожнага трактара прымацавана брыгада з двух чалавек — высокакваліфікаванага рабочага і падсобнага. Да рамонтнай брыгады прымацаваны тры мэханікі, узятыя заводам звонку (Віцебская МТС).

Прыбыўшыя часткі трактароў былі звалены ў груду і брыгадзір т. Посьнікаў затраціў два з паловай дні, каб рассартаваць іх. Усе часткі былі перамыты.

Рамонтная брыгада, усьвядоміўшы вялікую ролю трактараў у веснавой сяўбе, поўнасьцю мабілізавала сябе на хутчэйшы выпуск з рамонту трактароў. Паказваючы ўдарныя тэмпы бальшавіцкай работы, брыгада 24 сакавіка на 90 процантаў закончыла рамонт задніх мастоў усіх трактараў (сабраны дыфэрэнцыялы, каробка скорасьцей, поўвосныя кажухі і інш.). Таксама адрамантаваны задзія колы і перамацаваны шпоры. Прыступлена да рамонту матораў і муфт сцапленьня.

Брыгада абавязваецца поўнасьцю выпусьціць трактары з рамонту да вызначанага тэрміну—28 сакавіка, пры ўмове, калі поўнасьцю яна будзе забясьпечана ўсімі неабходнымі трактарнымі часткамі.

Да чатырох трактараў «Інтэрнацыянал», якія знаходзяцца ў рамонце, не хапае 170 частак (гільзы для цыліндраў, сёдлы, ролікавыя падшыпнікі, шайбы для пярэдніх восай і інш.). 60 процантаў нехапаючых частак завод здолен зрабіць і робіць сам (гайкі, поршневыя кольцы, утулкі для шатуноў, праточка цыліндраў і інш.), а такія часткі, як сухарыкі, гільзы для цыліндраў, шайбы, трубкі для радыятараў, шарыкаподшыпнікі і інш.—завод сам зрабіць ня можа. Недахоп гэтых частак тармозіць работу і зрывае своечасовы выпуск з рамонту трактараў.

Віцмалпрамтрэсту неабходна прыняць тэрміновыя меры, каб забясьпечыць завод усімі неабходнымі часткамі. Трактары павінны ісьці ў першых калёнах сталёвых коняй, забясьпечваючых пасьпяховасьць веснавой сяўбы.

Брыгадзір «В. П.» А. Іофінаў.

### Запчасткі ўсё яшчэ валяюцца на складах.

Заводам «Камінтэрн» 24 сакавіка выпушчаны з рамонту два блёкі для трактароў—адзін блёк для віцебскай МСТ, другі—для малпрамтрэсту.

На складзе заводу на 25 сакавіка ляжаць гатовымі і незабраныя аўтабазай 20 кажухоў пярэдняй восі, 40 броназавых утулак і 18 ролікаў для трактароў. Для малпрамтрэсту ляжыць гатовы і не забраны каленчаты вал для трактара.

На складзе заводу „Чырвоны мэталіст" на 25 сакавіка ляжаць адрамантаванымі і незабранымі Белсельдзяржснабам два трактарных плугі.

Ужо каля 10 дзён як гэтыя часткі валяюцца гатовымі на складах, а кіраўнікі аўтабазы, малпрамтрэсту і Белсельдзяржснабу працягваюць свае шкодніцкія дзеяньні, не забіраючы іх і не адпраўляючы па месцы прызначэньня.

Шкодніцкае супраціўленьне кіраўнікоў аўтабазы, малпрамтрэсту і Белсельдзяржснабу павінна быць зломлена. Запасныя часткі для трактараў і сельгасінвэнтар павінны быць тэрмінова дастаўлены па месцы прызначэньня.

## З усебеларускага зьезду перадавікоў сацыялістычнага земляробства.

### УЧОРА ПАДПІСАН ДАГАВОР САЦСПАБОРНІЦТВА КАЛГАСЬНІКАЎ ВІЦЕБСКАГА, МЕНСКАГА І ГОМЕЛЬСКАГА РАЁНАЎ.

МЕНСК, 25 САКАВІКА (ПА ТЭЛЕФОНЕ АД НАШАГА СПЭЦЫЯЛЬНАГА КАРЭСПАНДЭНТА).

СЁНЬНЯ, А 8 ГАДЗ. 15 МІН. РАНІЦЫ АДБЫЛАСЯ СУСТРЭЧА ТРОХ ДЭЛЕГАЦЫЙ: ВІЦЕБСКАЙ, МЕНСКАЙ І ГОМЕЛЬСКАЙ. НАРАДАЙ КІРАВАЎ Т. САДАВЫ—ДЭЛЕГАТ КАЛГАСУ ІМЯ СТАЛІНА, МАШКАНСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ. НА НАРАДЗЕ ДЭЛЕГАЦЫІ ДАЎМОВІЛІСЯ АБ АСНОЎНЫХ ПРЫНЦЫПАХ САЦДАГАВОРУ ТРОХ РАЁНАЎ, ЯКІ БУДЗЕ ПАДПІСАНЫ СЁНЬНЯ.

САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ ДАГАВОР ЗАКЛЮЧАЕЦЦА ТЭРМІНАМ ДА 1-ГА СЬНЕЖНЯ. У ДАГАВОРЫ ВЫЗНАЧАЮЦЦА КАНКРЭТНЫЯ ЗАДАЧЫ СЯЎБЫ І ПРАВЯДЗЕНЬНЕ 15 ЧЭРВЕНЯ ПРАВЕРКІ ВЫКАНАНЬНЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ У ЧАСТЦЫ ПАСЕЎНЫХ РАБОТ.

### НА ЗЬЕЗЬДЗЕ ВЫСТУПІЛІ тт. ГІКАЛО І ГАЛАДЗЕД.

А 6-й гадз. ўвечары 24 сакавіка зьезд адзначыў сваю работу. У спрэчках выказваюцца дэлегаты Заслаўскага, Рэчыцкага, Ушацкага раёнаў. З вялікай увагай была выслухана прамова старшыні СНК БССР тав. Галадзеда. У часе яго прамовы на зьезд прыходзіць першы сэкратар ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО, якога зьезд сустракае бурнай авацыяй.

Пасьля вячэрняга паседжаньня для дэлегатаў быў арганізаваны чырвонаармейскі вечар самадзейнасьці.

25 сакавіка працягваліся спрэчкі па дакладзе тав. Шаранговіча.

На вячэрнім паседжаньні выступіў, сустрэты бурнымі авацыямі, першы сэкратар ЦК КП(б)Б т. Гікало.

* * *

МЕНСК, 25. (Па тэлефоне). Сёньня ўвечары зьезд закончыў сваю работу. Зьездам прынята адозва да ўсіх калгасьнікаў Савецкай Беларусі.

26 сакавіка адбудуцца нарады з групамі дэлегатаў па асобных пытаньнях калгаснага будаўніцтва і падрыхтоўкі да сяўбы.

* * *

Сёньня ўвечары быў падпісаны дэлегатамі Меншчыны, Віцебшчыны і Гомельшчыны дагавор аб сацспаборніцтве трох раёнаў.

## Ударнікі сацыялістычных палёў у гасьцёх у ўдарнікаў прамысловасьці і Чырвонай арміі.

МЕНСК, 25 сакавіка (па тэлефоне ад нашага спэцкора).

23 сакавіка ўвечары група дэлегатаў усебеларускага зьезду наведала менскі завод імя Варашылава. Цёпла сустрэлі рабочыя калгасьнікаў-ударнікаў. За таварыскай вячэрай выступалі з прамовамі лепшыя ўдарнікі заводу і дэлегаты. Сярод выступаўшых былі і дэлегаты віцебскіх калгасаў т.т. ВЕТАШКОЎ і ДЖАН ВАЙ-ФУ.

Тут-жа частка дэлегатаў зьезду ўступіла ў сацыялістычнае спаборніцтва з ударнікамі заводу. Дэлегатка калгасу „Прагрэс", Бабініцкага сельсавету, ГАННА РАМАНАВА заключыла сацдагавор з работніцай-токарам ГАЛЕНАЙ ПЕЧАНЕЎСКАЙ. Тав. Раманава ўзяла на сябе рад абавязкаў па ўзорнай сьвінагадоўлі ў калгасе і па ўдзеле ў грамадзкай рабоце калгасу і сельсавету.

Учора да абеду дэлегаты зьезду наведалі чырвоныя казармы. Тут яны ўбачылі наколькі магутнай і тэхнічна-аснашчонай зьяўляецца наша Чырвоная армія ў выніку ажыцьцяўленьня першай пяцігодкі. Дэлегат калгасу „Прызыў", Бараўлянскага сельсавету, тав. ІВАНОЎ МАКАР у сваім лісьце да чырвонаармейцаў піша:

«Нельга нават апісаць таго захапленьня, якое стварылася ў нас пры прыёме нас Чырвонай арміяй і яе камандным складам, якія паказалі нам тое, чаго мы не чакалі. Мы настолькі ня ведалі магутнасьці нашай Чырвонай арміі! Гэта ўжо ня тое, што арміі былых гадоў».

**Пленум ГК і ГКК КП(б)Б, прызначаны на 26 сакавіка, АДКЛАДВАЕЦЦА.**

**Аб дні скліканьня пленуму будзе абвешчана дадаткова**

**Гарком, гарКК.**

## טייקעף פאנאנדערוויקלען די אנטיפייסעק-קאמפאניע,
### פארוואנדלען איר אין א שטורעם פאר אויספילן די פראדוציר-פלענער, פולקומער צוגרייטונג צום פרילינג-פארזיי, העכער די פאנ פון קלאסנוואכזאמקייט

### די גאטס-סטראפטשעס דארפן באנעגענען אן ארגאניזירטן ווידערשטאנד

# אראפרייסן די מאסקע פון דער יידישער בורזשואז-קלעריקאלער קליקע

## דער שטאטישער אפיקאר-סים-ראט פירט קיין אר-בעט ניט

הענען דער ארבעט פון דעם וויטעבסקער אפיקארסים פארבאנד קאן מען אורטיילן לויט דעם פאקט, וואס דער דאזיגער פונעם אפיקארסים-פארבאנד איז אינגאנצן צופאלן. די ארבעט איז אינגאנצן פאר-לאזן.

עס איז שוין געבליבן צוויי וואכן צו פייסעק און אף די פאבריקן הערט מען וועגן דער אנטירע-ליגיעזער ארבעט קיין וואר ניט.

אמן „פראפינטערן" טראגן זיך ארום די אנ-פירנדיקע כאווירים מיט אזעלכע מיינונגען, אז באם היינטיקן טאג איז שוין ניטא קיין נויטענדיקייט צו פירן אן אנטירעליגיעזע ארבעט, ווייל די ארבע-טער זיינען שוין ניט רעליגיעז.

אבער אין דער ווירקלעכקייט איז ווייט ניט אזוי. צוזאמען א טייל ארבעטער הערט מען נאך גאנץ אפט שמועסן וועגן גרייטן זיך צום פייסעק און וועגן באקן מאצעס. דער קלאסנסויג האט נאך א ווי-קונג אף א געוויסן טייל אפגעשטאנענע ארבעטער, וועלכע האבן נאך ניט אויסגעלעבט די אלטע טרא-דיציעס.

שארפער איז די פראגע אין די ארטעלן פון גע-ווערבפארבאנד און אינעם קאלוזירט „גייער לעבן", בא זיי זיינען נאך די טראדיציעס פון פראוון ד רעליגיעזע יאמטוויים גאנץ שטארק.

א גרויסע שולד אינעם אראפרייסן די אפיקאר-סים-ארבעט האט דער כ' קראסניק—דער פארזיצע פונעם ראט פון אפיקארסים-פארבאנד. ניט געגו וואס ער איז אומסעטיק, רייסט ער נאך אראפ זי צונגען.

דער אגיטפאסאפטייל און קולטפראפ פון שטאט פארקאם, דער קולטסעקטאר פון שטאטפארבאנ טראגן די פראגנטווארטלעכקייט פאר דער אפיקאר סים-ארבעט. טייקעף מוז די ארבעט אופגעלעב ווערן.

## מען שרייבט אונדז

### מיט די ווינונגען פון דער ווי נונגקאאפעראציע ספעקולירט מען

### קיין איין הייף אן א פארזייטן גארט

(א בריוו פון אן ארבעטער)

אין די הייזער פון דער ווינונגקאאפעראצ האבן מיר אויסגעלכע נים דערלאזבארע פאקטן, איינוווינער פון די זשאקטן ספעקולירן מיט זייער צימערן. זיי לאזן אריין אין זייערע צימערן שכ נים און נעמען וויפל מען וויל. אט זיינען פאקט אין זשאקט נומער 16 הויז 14 № האט דער אי ווינער אסיס פארדונגען אנעם וויסן פונעם זשא א צימער אף א גאנץ יאר צו 8 ר. א כודעש. אי דעמזעלבן זשאקט אין הויז נומער 22 האט מען א בערגעגעבן צימערן אן וויסן פונעם זשאקט. אוע כע פאקטן קען מען טרעפן אין אלע זשאקטן.

די שטאטישע ווינונגסקאאפעראציע פארנע זיך איצט מיט דער פראגע, אז אין די זשאקטן, ו עס געפינען זיך פריי פלעצער, זאלן פון די אי ווינער פארזיים ווערן. די פארוואלטונגען פון זשאקטן מוזן זיך גלייך מאפיליזירן אף דורכפירן מאסמיטלען.

יעדער פיישטשיק דארף ארויסווייזן די מאקס מאלסטע אקטיווקייט אין דער קאמפאניע, ווי דאס וועט פארבעסערן דעם סאנינטארן צושטאנ פון די הייזן. אווידאן.

## דער כ' סווערדעל רייס ארא פ די מאפר-ארבעט

(„פראפינטערן")

די ביוראָ פון מאפר-קעמערל אין דער שפ פון כ' סווערדעל טוען אבסאליוט גארניט אף אוע לעבן די מאָפר-ארבעט.

דער פארט-קאָלעקטיוו האָט שוין ניט איינמ באאנדלט די פראגע וועגן דעם צושטאנד פון ד מאָפר-ארבעט, אבער אָן רעזולטאטן. ס'ווערט ו געפירט קיין שום ארבעט אף אופמאנען די מיטגל אָפּצאל. מען קומט פאר 8—10 כאדאשים. אין אלג מיין מוז מען קאנסטאטירן, אז די מאָפר-ארבעט א פארלאזענער געביט אף דער פאבריק „פראָפ טערן" דער פארט-קאָלעקטיוו דארף פארזיכערן מאפר-ארבעט מיט אזעלכע ארבעטער, וועלכע ז זיין פארינטערעסירט מיט דער ארבעט.

איגאלניקאוו.

מאכטן טארטיילער פון די שניידער איז דער אי טום צוטיילט געווארן אזוי: 40 פראצ. דעם „פר פינטערן" און 60 פראצ. „פאן פון אינדוסטריאלי ציע". אבער ביין היינטיקן טאג איז די צעטיל נאך ניט דורכגעפירט געווארן. אויסרעדעם קו אונדז ארויס 120 טאָן געטעגער-געוויקסן, 20 כ זיידים, מאמאס א. א. וו. דאָס אלץ האט דער פא טיילער פון „אינדוסטריאליזאציע-פאן" זיך צוגע מען.

אויספיר: דער צעך פון ארבעטער-באזאָרג פון דער פאבריק „פראָפינטערן" האָט זיין אָרב איבערגעבויט ניט געגונגען. א גרויסע שולד טראָ די אדמיניסטראציע פון פאבריק, וועלכע פארשט ניט, אז דעם פארמאכטן פארטיילער דארף אפ געבן הערן אָוא אכט, ווי די איבעריקע צעכן פאבריק.

רעד-בריגאדע: קורבאוו, רעזנ פרומינע, אווידאן, ליסאווע, איג ניקאוו, אוזדין.

Вінгарніт № 12.

די יידישע בורזשואזיע אין אויסלאנד און דער קלעריקאלער טראָנט פון ראָבאָנים, גאטס סטראפ-משעס, ווייסעס-גראנטן, מיט דער הילף פון ליטע-ראישע זשוליקעס און דער בורזשואזער פרעסע האבן אנגעהויבן איצט, ארגאנערן צורעק פון אנקו-מענדיקן קלעריקאלן יאָנטעוו פייסעק, א געמיינע אינטערווענטישע העצע קעגן סאָוועטפאראדן. די יידישע דאנאנים אין פוילן, אין דער שפיץ מיט די באנקירן, דזורנאליסטישע מענוואָאלים און ווייסעמי-גראנטן האָבן ארויסגעלאָזן אן אופרוף, אין וועלכן זיי דרידן הויען אַ „פארצווייפלטער לאזע" פון די יידן אין רוסלאנד, וועלכע „זיינען מאמעש אויס פון הונגער און דאנגלען זיך מיטן פויס". דער דאנ-נישער געמייאכץ אין ערעץ-ייסראָעל רופט אַלע יידן צו אַ טאָגעס, „אַלס אויסדריק פון אופרעגונג און פראטעסט פון וועלט-יידנטום קעגן די דרידיעס אף די יידן אין סאָוועטן-רוסלאנד". זיי באנוגענען זיך ניט מיט בעטן דעם ריבונע שער אוילעם, דאוונען און פאסטן, נאָר זיי הענדן זיך וועגן „איינגערנען אנטיסאָוועטישע דעמאָנסטראַ-ציעס". די יידישע קאנטרדעוואליוציע אין אויס-לאנד האט אין נאמען פון פייסעק און „מאצע-פעק לעך" צו פארשטארקן די אנטיסאָוועטישע קאמפא-ניע, גייענדיק צוזאמען מיטן אימפעריאליסטיש-פא-שיסטישן פראָנט, וואָס נרייט צו די מילכאָמע קעגן סאָוועטנאראבאנד.

זי איז ניט קלאָר, אז די אנטיסאָוועטישע דע-כילעס אונטערן שלייער פון „פייסעק-הילף די יידן אין רוסלאנד" האָט דעם ציל צו פארדעקן די אינ-טערנאציאָנאלע באדייטונג פון אונדזער סאציאלי-סטישער בויונג און דערלימזונג פון דער לענינישער נאציאנאלער פאליטיק, וואס האט ליקווידירט די עקאנאמישע, פאליטישע און קולטורעלע אויסגלייכ-הייט פון אלע נאציאנאליטעטן אין סאָוועטנאראבאנד צווישן זיי אויך פון די יידישע ארבעטנדיקע מאסן.

די יידישע קלעריקאלן, די געוועזענע נעפמא-נעס און עקספלואטאטאריש עלעמענטן בא אונדז וועלן איצט פרוווען אויסנוצן דעם קלעריקאל יאנ-טעוו פייסעק, קעדיי צו גרופירן אום זיך די אָפּ-געשטאנענע ארבעטנדיקע מאסן און זיינען אין זיי קלעריקאל-שאוויניסטישן האַס צום פראלעטאריש-אינטערנאציאנאליזם, שטערן דער באלשעוויזאציע פון די יידישע ארבעטנדיקע, צובינדן זיי צום קלערי-קאלן קלאס פון פייסעק-טראדיציעס, מאצע און די אנדערע זאבאבונעס, אפוויסן זיי פון דער קאנ-קרעטער ארבעט און קאמף פאר דער סאציאליסטי-שער בויונג.

די אנטי-פייסעק-קאמפאניע מוזן מיר איצט פירן אונטערן צייכן פון קאמף קעגן די בורזשואז-נאציע-נאליסטישע מאנעווערן צו שטערן דעם פיילינגפארזיי, שעדיקן די קאלוזירטן, קעגנווירקן די דערגרייכונגען פון דער נאציאָנאל-קולטורעלער בויונג.

מיר דארפן זאגן, אז דער אנטירעלי-גיעזער קאמף איז בא אונדז באדייטנדיק אין באזונדערע ריינגען אפגעשוואכט. די אפיקארסים-קעמערלעך אף א ריי פאבריקן און זאוואדן זיינען אומטעטיק. בא אייניקע טוער הערשט די אפארטוניסטישע מיי-נונג, אז די רעליגיעזע איבערבלייבענישן בא די ארבעטנדיקע זיינען שוין פארניכ-טעט ביין סאף.

די אנטיפייסעק-קאמפאניע דארף מיטהעלפן צו פארשטארקן די קולט-פאָליס-מאסן-ארבעט אף דער אונטערנעמונג, אין די קאלוזירטן. קוסטאר. ארטעלן. מיר דארפן באקעמפן יעדן פרוח פון קלאסן טוינע פון פארשידענע „געוועזענע" און דער קלעריקא-לער קליקע, צו האבן א ווירקונג אף די ארבעטנ-דיקע, אויסוואצלען פון שטייגער פון די יידישע ארבעטנדיקע יעדן שפור פון רעליגיעז-שאוויניסטי-שער איבערבלייבענעניש. אונטערנעמען א ברייטע סאָ-ציאליסטישע איבערדערציונג פון די מאסן אין קאמף פאר די פרינציפן פון פראלעטארישן אינטערנאציאָ-ליזם, פון באוווסטזיניקן קאמף פאר דער סאציאלי-סטישער בויונג און קולטור.

די ברייטע יידישע ארבעטנדיקע מאסן פון סאָ-וועטנאראבאנד וועלן אופרעקן דעם עמעסן אינהאלט פון דער בורזשואז-קלעריקאלער דעמאגאגיע פון דער יידישער בורזשואזיע אין אויסלאנד, וועלכע איז דורכגעזאטט מיט אנטיסאָוועטישע ציל, זיי וועלן אראפרייסן די מאסקע פון דער אויסלענדישער און „היימישער" בורזשואז-קלעריקאלער קנופיע, ווייל איר קאנטרדעוואָליוציאָנערן פאָנעם, ענטפערן מיט א מארשטארקטן קאמף פארן אויסטיל דעם פרילינג-מארזיי, מאר אקטיווער באטייליקונג אין דער סאָ-ציאליסטישער בויונג, קעגן נאציאנאלער איינגע-שלאסנקייט, קעגן רעליגיעז-שאוויניסטישן סאָם, פאר די פרינציפן פון פראלעטארישן אינטערנאציאָנא-ליזם, פאר דער אינטערנאציאנאלער סאלידאריטעט פון אלע ארבעטנדיקע!

(פון לייטארטיקל „אקטיאבער").

## 15 יאר „וואהרהייט"-„עמעס"
### 15 יאר קאמוניסטישע פרעסע אין יידיש

דעם 7 מארץ איז געווארן 15 יאָר זינט עס איז דערשינען אין פעטראָגראד. איצט לענינגראָד דער ערשטער נומער פון דער ערשטער אין דער וועלט באלשעוויסטישער צייטונג אין יידיש—די „וואָר הייט". די „וואָרהייט" איז, עמעס, דערשינען ווי אַן אָרגאן פון די ס. ד. באָלשעוויקעס און לינקע סאָ-ציאליסטן-דעוואָליוציאָנערן", אָבער די אויבערהאנט האָבן אין איר געהאט די באָלשעוויקעס און איר פאראנטוואָרטלעכער רעדאקטאר און אָנפירער איז געווען כ' ש. ד י מ אָ נ ש ט י י ן.

דעם 7 אָוגוסט 1918 יאָר איז די „וואָרהייט" פאריוואנדלט געווארן אין א טעגלעכער צייטונג, איר נאָמען איז געענדערט געווארן אף „עמעס". (דערווייל נאָך „אמת"—מיטן העברעישן אויסלייג), און די שטעמע מיט די לינקע עסערן איז ליקווידירט געווארן—דער „עמעס" איז שוין דערשינען אלס „אר-גאן פון די קאָמוניסטן-באָלשעוויקעס" „אויסגאבע פון דעם צ. ק. פון דער פארטיי קאָמוניסטן-באָלשע-וויקעס.

נאכן 14-טן נומער איז דער „עמעס" אפגעשטעלט געווארן און פונסניי אנגע-הויבן דערשיינען דעם 7 נאיאבר 1920 יאר. עס דערשיינען 37 נומערן און די צייטונג ווערט ווידער אָפּגעשטעלט.

די צייטונג ווערט באנייט אין 1921 יאָר אינטער כ' מ. ליטוואקאווס רעדאקציע.

דעם 1 מיי 1921 יאָר דערשיינט אַ נומער „עמעס". ווידער אַן איבעריס ביזן 2 סעפטיאבער 1921 יאָר, פון ווען אָן דער „עמעס" דערשיינט שוין נאָרמאל ביז היינטיקן טאָג.

ביז מארץ 1930 איז דער „עמעס" דערשינען אַלס אָרגאן פון דער צ. ב. פון די יידסעקציעס באם צ"ק פון אונדזער פארטיי, פון סארט 1930—נאָך דער ליקווידאציע פונעם נאצעקטער באָם צ"ק—דערשיינט דער „עמעס" אלס אָרגאן פונעם נאציאָנאליטעטן-ראט פונעם צא"ק פון סס"ר.

15 יאר „וואָרהייט"—„עמעס" איז 15 יאר קאמוניסטישע פרעסע אין יידיש, און דער 15-יאריקער יובילי פון „וואָרהייט"-„עמעס" וועט דורכגעפירט ווערן ווי דער 15-יאריקער יובילי פון דער באלשעוויסטישער פרעסע אין יידיש.

די דעראקציע פונעם „עמעס" האָט באשלאָסן די פייערונג פונעם יובילי אָריבערטראָגן אָפּן 5-טן מיי צום סאָג פון דער באָלשעוויסטישער פרעסע, וואָס איז פארבונדן מיט דער געבורט פון דעם צ. אָ. פון אונדזער פארטיי—די „פראווד".

## בריטער פאנאנדערוויקלען די זעלבסטפארגריי-טונגען — פארבעסערן די ארבעטער-באזארגונג

דער פארמאכטער קאָנפערענץ פון דער פאבריק „פראָפינטערן", וועלכער האט זיך ארגאניזירט נאך דער ליקווידאציע פון דעם פריערדיקן פארמאכטן פארטיילער פון די שניידער, האט אין אַ גאנצע ריי געפיסן פון זיין ארבעט געוויסע דערגרייכונגען.

דער קוואַרטלינפלאן פונעם פארמאכטן קאָנפערענץ איז, וועלכער איז געווען אויסגערעכנט אף א סו-מע פון 260 טויזנט רובל, איז פון דער זייט פון דער פארוואלטונג געווען ארויסגעוואָרפן אן אנטקעגנדי-קער פלאן אין א סומע פון 400 טויזנט רובל. אין יאנואר כודעש איז דער האנדלפינפלאן געווען אויסגעפולט אף א סומע פון 102 טויזנט רובל.

דער פארמאכטער קאָנפערענץ האט ארויסגעוויזן א גיוויסע חילף מיט באזארגן דער סטאלאווע מיט פראדוקטן פון ערשטן געבדויך.

אבער ניט קוקנדיק אף דעם, האָט דער פאר-מאכטער פארטיילער נאך ניט באוויזן איבערצובויען זיין ארבעט, וואס זאל אנטשטרענגען די אופגאבן, וואס שטיין פאר א באזארגונג-צעך. אראונ דער שוואכער פאנאנדערוויקלונג פון די זעלבסטפארגריי-טונגען איז דער פאיאר ניט קיין באפרידיקענד. עס איז ניט ארגאניזירט א ב א ז ו נ ד ע ר בעסערע באזארגונג פאר שלאוזלער. ס'זיינען פארען ניט קיין געדעקטע אוואנס-ארדערס אף 7000 ר.

ניט באפרידיקט איז די פינאנציעלע לאגע פונעם פארמאכטן פארטיילער. דער לעצטער איז אויסגעקו-מען צוטרעטן צו דער ארבעט אלס א נייארגאני-זירטן, גארניט באקומענדיק פונעם פריערדיקן פאר-מאכטן פארטיילער פון די שניידער.

מיט גרויסע אָנשטרענגונגען האט אונדז די ווייט-נייפארייניקונג אפגעלאזן 80 טויזנט און דער ווייט-קאאפפארבאנד 150 טויזנט רובל און אף אויסק-שטעלן די ארבעט פארערט זיך. מינימום א סומע פון 250 טויזנט רובל.

די לאגע פארערט פון דער דירעקציע, אז זי זאָל ארויסווייזן חילף דעם פארמאכטן פארטיילער, אבער אין דער ו י ר ק ל ע כ ק י י ט זעען מיר א פ א ר ק ע ר ט ע ד ע דערשיינונג. דעם 21-פעברואל איז דער כ' וואַרקין ארויס א פאראָרדע-נונג דער פארוואלטונג, אז זי זאל אומקערן די סו-מע, וועלכע די פאבריק האט געגעבן דעם פריער-דיקן פארמאכטן פארטיילער און די סומע 80 טויזנט פון דער וויסנשאפטלעכער-אָרגאניזאציע-פאן" זיך צוגע מען.

אויספיר: דער צעך פון ארבעטער-באזאָרג פון דער פאבריק „פראָפינטערן" האָט זיין אָרב איבערגעבויט ניט געגונגען. א גרויסע שולד טראָ די אדמיניסטראציע פון פאבריק, וועלכע פארשט ניט, אז דעם פארמאכטן פארטיילער דארף אפ געבן הערן אָוא אכט, ווי די איבעריקע צעכן פאבריק.

רעד-בריגאדע: קורבאוו, רעזנ פרומינע, אווידאן, ליסאווע, איג ניקאוו, אוזדין.

Вінгарніт № 12.

*У дапамогу дакладчыку па адзіным палітмасавым дні, прысвечаным увядзеньню пашпартнай сыстэмы.*

## ДЛЯ ЧАГО ЎВОДЗІЦЦА ПАШПАРТНАЯ СЫСТЭМА.

Мы будуем сацыялізм ва ўмовах жорсткай клясавай барацьбы. У Кастрычніцкія дні 1917 году і ў гады грамадзянскай вайны клясавы вораг выступаў супроць нас у адкрытым баі. Мы яго перамаглі. Але гэта ні ў якім разе не азначала і не азначае, што клясавы вораг прымірыўся са сваім паражэньнем, што клясавая барацьба скончылася.

«Ня было яшчэ ў гісторыі такіх выпадкаў, каб адміраючыя клясы добраахвотна ўходзілі са сцэны. Ня бывала яшчэ ў гісторыі такіх выпадкаў, каб адміраючыя буржуазія не спрабавала ўсіх рэшткаў сваіх сіл, для таго, каб адстаяць свае існаваньне... Наша прасоўваньне ўперад, наш наступ будзе скарочваць капіталістычныя элемэнты і выцясьняць іх, а яны, адміраючыя клясы, будуць супраціўляцца, нягледзячы ні на што». (Сталін).

Аджываючыя клясы іменна таму, што адчуваюць сваю нямінучую гібель, шалёна супраціўляюцца сацыялістычнаму наступу. Гэта супраціўленьне клясавых ворагаў выражаецца, у прыватнасьці, у тым, што яны, пралязаючы, на нашы сацыялістычныя прадпрыемствы і ў дзяржаўны апарат, спрабуюць шкодніцтвам, хіцтваньнямі дзяржаўнай маёмасьці, контрэвалюцыйнай агітацыяй падарваць нас знутры.

На падставе суцэльнай калектывізацыі пасьпяхова ліквідуецца кулацтва—гэта апошняя эксплёататарская паразытычная кляса. Тысячы кулакоў, выкрытых у калектывізуючайся вёсцы, рынуліся ў гарады, зразумела не для таго, каб заняцца грамадзка-карыснай працай. Яны бягуць у горад для таго, каб жыць тут паразытычна, не працуючы, г. зн. так, як яны жылі ў старой вёсцы.

З кулакоў і прадстаўнікоў былых эксплёататарскіх клясаў гораду фармуюцца банды спэкулянтаў прадуктовымі карткамі, перакупнікаў і арганізатараў чаргаў, перашкаджаючых працоўным атрымліваць у магазыне неабходныя прадукты. Надта часта чаргі ў прамтаварных магазынах у значнай меры складаюцца з перакупнікаў.

З кулацтва ў горадзе фармуюцца ня толькі таргашаскія, але і вараўскія элемэнты і банды скупшчыкаў пакрадзенага. Рэшткі ліквідуемага кулацтва, прыяжджаючыя ў горад, хутка ўваходзяць у кантакт з прадстаўнікамі былых эксплёататарскіх клясаў гораду і дэзарганізуюць работу нашых органаў снабжэньня: расхіцчаюць прадукты, выступаючы ў ролі перакупнікаў, уздуваюць на рынку цэны на прадукты калгаснай вытворчасьці; перасяляючыся ў горад, яны перагружаюць яго, пераўплатняюць жыллоплошчу.

Ці можам мы цярпець, каб гэтыя паразытычныя элемэнты працягвалі сваю падрыўную работу ў нашых гарадох, у жыцьцёвых прамысловых цэнтрах краіны?

Наша важнейшая задача—ачысьціць, разгрузіць пралетарскія прамысловыя цэнтры і гарады ад усіх паразытычных элемэнтаў—кулакоў, вароў, жулікаў, хуліганаў.

Пастанова ўраду аб увядзеньні адзінай пашпартнай сыстэмы дапаможа пасьпяховаму вырашэньню гэтай задачы.

(Працяг у наступным нумары)

**КАЛДАГАВОРНАЯ КАМПАНІЯ 1933 году.**

# Масава і апэрацыйна, як на акулярнай фабрыцы, правесьці калдагаворную кампанію.

«ПАСКОРЫЦЬ ПЕРАГЛЯД УСТАРЭЎШЫХ І ЯЎНА ПАНІЖАНЫХ НОРМ З ТЫМ КАБ СКОНЧЫЦЬ ГЭТЫ ПЕРАГЛЯД ДА 1-га КРАСАВІКА. ДА ПЕРАГЛЯДУ НОРМ ПРЫЦЯГНУЦЬ НАЙБОЛЬШ СТАРЫЯ КАДРЫ РАБОЧЫХ-УДАРНІКАЎ. ПЕРАГЛЯД НОРМ ПРАВОДЗІЦЬ НА АСНОВЕ ТЭХНІЧНАГА НАРМАВАНЬНЯ, А ТАКСАМА ВОПЫТНА-СТАТЫСТЫЧНЫХ ДАННЫХ АБ ФАКТЫЧНАЙ ВЫПРАЦОЎЦЫ».

*(З пастановы ЦОПСБ і наркаматаў ад 7 сакавіка 1933 г.)*

## ВОПЫТ, ВАРТЫ ПЕРАЙМАНЬНЯ.

18-га сакавіка ў клюбе мэталістаў сабрэліся герої першай пяцігодкі—лепшыя ўдарнікі, старыя работныя акулярнай фабрыкі, 140 рабочых за чашкай гарбаты абмяркоўвалі свой непасрэдны ўдзел у калдагаворнай кампаніі гэтага году.

Дырэктар фабрыкі т. Галуза зрабіў даклад аб задачах ударнікаў у сувязі з калдагаворнай кампаніяй.

Разгарнуліся ажыўлёныя спрэчкі. Вось т. Рэйзін указвае, што шліфавальны цэх адстае, дае 95 проц. браку. Ён расцэньвае гэта як расхлябанасьць і безадказнасьць адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу. У зборачным, падрыхтоўчым і шліфавальным цэхах існуе яшчэ абязьлічка, рабочых перакідваюць з аднаго працэсу на другі, не загружана абсталяваньне механічнага цэху.

За адзін гэты вечар паступіла 100 прапаноў па палепшаньні р а б о т ы вытворчасьці. Р а б к о р - м э х а н і к Фэйгін узяў на с я б е абавязак абслугоўваць зьмену адзін. (Зьмену абслугоўваюць 2 мэханікі). Кантралёр Гінзбург абавязаўся азнаёміць усіх кантралёраў шліфавальнага цэху з усімі працэсамі вытворчасьці. Практыкаваць вытворчыя нарады (скразныя) брыгад і цэхаў. Рабочы шліфавальнага цэху т. Макушын унёс прапанову, каб награваць электрапечы на дзьве гадзіны раней да пачатку работы з тым, каб рабочыя маглі адразу распачаць работу, не прастайваючы па некалькі гадзін.

На гэтай таварыскай сустрэчы рабочыя адобрылі пастанову аб пераглядзе заніжаных і ўстарэлых нормаў. Тут-жа лепшыя ўдарнікі высунулі сустрэчныя нормы. Работніца зборачнага цэху Багданава, працуючая на фітлу, ранейшая норма 550 акуляраў у дзень, абавязалася даваць 650. Работніца падрыхтоўчага цэху Якубсон (пайка) высунула сустрэчную норму 3700 замест цяперашняй нормы 3000, Сапожнікава (пайка) замест 1020 абавязваецца даць 1300, Сіняковў (працуючы на пучоўцы ў шліфавальным цэху) замест ранейшай нормы 160 адзінак, высунуў 300.

С. Багары.

## *ХРОНІКА КАЛДАГАВОРНАЙ КАМПАНІІ.*

На пасяджэньні прэзыдыуму гарпрафсавету 19 сакавіка былі заслуханы даклады старшынь ФЗМК фабрык: «Сьцяг індустрыялізацыі», імя Клары Цэткін, скабяной, лямецкай, шчацінна-шчотачнага камбінату, хлебазаводу, фанэрнага, «Лесбел», ГК саюзу работнікаў устаноў і ГК саюзу грамадзкага харчаваньня аб масавай праверцы выкананьня калдагавароў за 1932 г. П р э з ы д ы у м ГСПС прызнаў ход падрыхтоўкі да заключэньня новага калдагавору і яе сустаўной часткі—работы па пераглядзе норм па гэтых прадпрыемствах нездавальняючым і абавязаў усіх старшынь ФЗМК і гарадзкіх праўленьняў саюзаў безадкладна пераключыцца на распрацоўку новага калдагавору, на падставе дырэктыўнага ліста ЦСПСБ.

✻ 21 сакавіка адбыўся агульнагарадзкі сход партыйнага і прафэсыянальнага актыву па пытаньні перазаключэньня калдагавароў. Партыйны і прафактыў выклікаў на сацспаборніцтва партыйны актыў і прафарганізацыі Гомелю на бальшавіцкае завяршэньне калдагаворнай кампаніі, на лепшае правядзеньне веснавой сяўбы ў прыгарадных гаспадарках і пашпафных калгасах.

✻ На скурзаводзе шырока разгарнулася калдагаворная кампанія. У час кампаніі створана 5 тэхнічных гурткоў, у якія ўцягнута 65 рабочых. РКК за гэты час разабрала 238 заяў—канфліктаў, з іх 84 вырашаны на месцы. Праводзіцца пераглядзе заніжаных норм выпрацоўкі. З 51 нормы ужо перагледжана 25.

✻ На дрожджазаводзе калдагаворная кампанія саправаджаецца зборам рабочых прапаноў. Паступіла 7 каштоўных рацыяналізатарскіх прапаноў. 35 рабочых, 9 ІТР і 3 служачых, аб'яднаныя ў брыгады, правяраюць выкананьне калдагавору за мінулы год.

## ЗА ЗАТРЫМКУ ЎЗНОСАЎ ДЗЯРЖАВЕ ПРЫЦЯГВАЦЬ ДА СУРОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ.

### Пастанова прэзыдыуму гарсавету ад 23-га сакавіка.

Праверкай правільнасьці налічэньня, утрыманьня і своечасовасьці здачы ў Дзяржбанк утрыманых сум з рабочых і служачых па культжылзборы і прыбытковым падатку за 1933 год на прадпрыемствах, в ўстановах, арцелях і арганізацыях гораду Віцебску ўстаноўлена, што:

культжылзбор утрымліваўся ня пры выдачы зарплаты за першую палову месяца, а наадварот, за другую палову (люстэркавая фабрыка, Хэмлесгас, арцель «Хэмік»);

утрымліваўся два разы ў месяц за кожныя два тыдні замест устаноўленага дэкрэтам ураду аднаго разу ў месяц, цалкам за м е с я ц (Учдор—701);

утрыманыя сумы здаваліся ў Дзяржбанк не адразу пры атрыманьні зарплаты, а праз 5—20 дзён (люстэркавая фабрыка, Учдор—701, Саюзскур, дрэваапрацоўчая фабрыка камітэту ўзаемадапамогі, фабрыка гнутай мэблі і арцель «Хэмік»);

прыбытковы падатак утрымліваўся 15-га студзеня г. г. за сьнежань 1932 г. (Учдор—701);

утрыманыя сумы па прыбытковым падатку здаваліся ў Дзяржбанк праз 10 і больш дзён пасьля ўтрыманьня і атрыманьня зарплаты (люстэркавая фабрыка, Учдор—701, скурзавод, дрэваапрацоўчая фабрыка, арцель «Хэмік»);

утрыманыя сумы па пазыцы перадаваліся ў Дзяржбанк праз месяц пасьля ўтрыманьня (Саюзскур).

Выходзячы з вышэйпаказанага, прэзыдыум гарсавету п а с т а н а ў л я е:

За няправільнае ўтрыманьне культжылзбору і прыбытковага падатку і несваечасовае пералічэньне ўтрыманых сум у Дзяржбанк па гэтых падатках і па пазыцы, даручыць гарпракурору ў тэрміновым парадку прыцягнуць да судовай адказнасьці бухгальтэра Учдор—701—Сьміриова і бухгальтэра Саюзскур—Азерскага.

Бухгальтэраў: люстэркавай фабрыкі—Мэрзона, дрэваапрацоўчай фабрыкі камітэту ўзаемадапамогі—Лебедзева, фабрыкі гнутай мэблі—Якабсона, арцелі «Хэмік»—Эпштэйна аштрафаваць па 50 р. кожнага.

Прапанаваць усім кіраўнікам і галоўным бухгальтэрам устаноў, прадпрыемстваў і арганізацый гор. Віцебску і раёну пад іх асабістую адказнасьць зараз-жа праверыць становішча ўсіх разьлікаў па прыбытковым падатку, культжылзборы і пазыцы, і пералічыць у Дзяржбанк усе нязданыя сумы па гэтых утрыманьнях, як за студзень і люты, так і за сакавік г. г. не пазьней 27 га сакавіка г. г. і ў далейшым гэту справу ўзяць пад асобы кантроль.

Прапанаваць Дзяржбанку выканаць пастанову аб адначасовым пералічэньні вышэйпамянёных сум пры выдачы зарплаты прадпрыемствам і ўстановам, даручыўшы тав. Эстрыну выявіць вінаватых у невыкананьні гэтай пастановы да сучаснага моманту і па вінаватых накласьці адміністрацыйнае спагнаньне.

Старшыня гарсавету Кардашэнка.
Сэкратар Квінта.

Адказны рэдактар Л. РОЗЭНБЛЮМ.

Друкарня „Камінтэрн", Бальшавіцкая, 10. Тыраж 8.500 экз.